Е. Н. Празароўская—ваенны ўрач 3-га ранга

ДЭМАНСТРАЦЫЯ МАРАЛЬНА-ПАЛІТЫЧНАГА АДЗІНСТВА

24 сакавіка народы заходніх абласцей Украіны і Беларусі выбралі дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР і Вярхоўныя Советы Украінскай і Беларускай совецкіх рэспублік. Гэты дзень увойдзе ў гісторыю нядаўна вызваленых народаў, як дзень велізарнейшага свята і таржаства. Упершыню за ўсё сваё жыццё працоўныя беларусы, украінцы, палякі, яўрэі, рускія гэтых абласцей галасавалі за сапраўдных прадстаўнікоў народа, за лепшых сваіх сыноў і дачок.

Выдатнымі аказаліся рэзультаты выбараў. 99,09 процанта выбаршчыкаў галасавалі па выбарах у Совет Саюза Вярхоўнага Совета СССР і 99,10—у Совет Нацыянальнасцей. 98,07 процанта ўсяго ліку выбаршчыкаў, прымаўшых удзел у галасаванні па выбарах у Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцей, аддалі свае галасы за кандыдатаў нераможнага блока комуністаў і беспартыйных.

Па выбарах у Вярхоўны Совет БССР 99,27 процанта выбаршчыкаў прымалі ўдзел у галасаванні, з іх 97,97 процанта галасавалі за дэпутатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Якія выдатныя лічбы! Яны ярчэй за ўсё гавораць аб аграмаднейшай любві працоўных заходніх абласцей Украіны і Беларусі да комуністычнай партыі, да совецкага ўрада, да роднага таварыша Сталіна.

Моладзь і старыя—мужчыны і жанчыны ішлі да выбарчых урнаў з пачуццем велізарнейшай радасці. Да позняга вечара многія выбаршчыкі не разыходзіліся з выбарчых участкаў. Тут доўга не змаўкалі радасныя песні аб нераможнай Чырвонай Арміі, аб шчаслівым жыцці совецкага народа.

— Мне 105 год,—сказала самая старая выбаршчыца вёскі Шоці, Глубоцкага раёна, Амелія Раманаўна Маскалёнак,—я дачакалася такога жыцця, аб якім доўга марыла. За гэта жыццё я цяпер галасую.

На многіх бюлетэнях былі надпісы, у якіх выбаршчыкі горача дзякавалі комуністычную партыю, таварыша Сталіна і родную Чырвоную Армію, за сваё вызваленне. На адным з бюлетэняў, апушчаных у ўрну на 14 выбарчым участку г. Баранавічы былі надпісы: «Няхай жыве комуністычная партыя!», «Няхай жыве вялікі Сталін!», «Няхай жывуць усе члены Палітбюро ЦК ВКП(б)!» У выбарчай урне 4 участка аказалася запіска з надпісам: «Дзякуй, дзякуй таварышам Сталіну і Варашылаву за вызваленне нас ад гнёта польскіх паноў».

Выбранымі аказаліся ўсе кандыдаты Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Сярод дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР ад заходніх абласцей Украіны і Беларусі—12 жанчын, і сярод дэпутатаў Вярхоўнага Совета БССР 38 жанчын. Яны, як і ўсе дэпутаты, з'яўляюцца лепшымі прадстаўнікамі свайго народа, якія на справе паказалі сваю адданасць комуністычнай партыі, сваё ўменне змагацца з ворагамі, сваю любоў да народа.

«Наша пролетарская рэволюцыя,—гаварыў таварыш Сталін у сваім выступленні на першай усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў,—з'яўляецца адзінай у свеце рэволюцыяй, якой давялося паказаць народу не толькі свае палітычныя рэзультаты, але і рэзультаты матэрыяльныя». Прайшло больш 6 месяцаў, як наша доблесная Чырвоная Армія вызваліла працоўных Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ад прыгнёта польскіх паноў. За гэты кароткі час праробліна велізарнейшая работа ў палепшанні матэрыяльных і бытавых умоў працоўных.

Зямля, на якой было праліта так многа поту і крыві батракоў і беднякоў, і якая належыла панам—радзівілам, тышкевічам і ім падобным, знаходзіцца цяпер у руках сялян. Сотні тысяч гектараў зямлі атрымалі былыя батракі, беззямельныя і малазямельныя сяляне. Звыш 25 тысяч бескароўных і 10 тысяч гаспадарак, якія не мелі коняй, надзелены каровамі і коньмі. Перадавыя сяляне выказваюць жаданне аб'еднацца ў калгасы. Па прынцыпу строгай добраахвотнасці ўжо створаны калгасы ва многіх вёсках. Партыйныя і совецкія арганізацыі дапамагаюць ім арганізацыйна ўмацавацца. Ва многіх месцах створаны МТС. Тут упершыню на соцыялістычных палях будуць працаваць трактары і іншыя сельскагаспадарчыя машыны.

Фабрыкі і заводы, на якіх жорстка эксплаатаваліся сотні тысяч пролетарыяў, нацыяналізаваны. Па-другому стала работаць прамысловасць. 20 000 працоўных будуюць Днепра-Бугскі канал. Тэкстыльшчыкі Беластока на рэканструяваных прадпрыемствах у гэтым годзе выпусцяць больш 10 мільёнаў метраў тканіны. Па-новаму пачалі працаваць кожны рабочы і работніца. Яны ведаюць, што працуюць цяпер не на капіталістаў, а на сябе, што ім не пагражае беспрацоўе, іх не палохае заўтрашні дзень. Яны ведаюць, што працуюць на карысць сваёй соцыялістычнай радзімы.

Навука перастала быць здабыткам горсткі багацеяў. Сотні тысяч дзяцей і моладзі селі за парты ў школах і вышэйшых навучальных установах. З прагнасцю ўзяліся яны за вучобу, аб якой так многа марылі ў недалёкім мінулым. У заходніх абласцях Беларусі створаны 4 вышэйшых навучальных установы і 8 педагагічных вучылішч. Працуе звыш 4 000 школ, у якіх выкладанне вядзецца на роднай мове.

Жанчыны заходніх абласцей адчуваюць, якія вялікія клопаты праяўляюць аб іх і іх дзецях совецкая ўлада і комуністычная партыя. На фабрыках і заводах пачалі працаваць яслі і сады.

Выбіраючы сваіх дэпутатаў, выбаршчыкі давалі ім наказ быць дзеячамі ленінска-сталінскага тыпу, працаваць па-сталінску на блага народа, на ўмацаванне соцыялістычнай радзімы. Выбраннікі народа прыступілі да работы і да выканання народнага наказа.

На выбарах у Вярхоўныя Советы СССР, УССР і БССР працоўныя заходніх абласцей Украіны і Беларусі прадэманстрыравалі перад усім светам сваю непарыўную сувязь з совецкім народам і комуністычнай партыяй. Пад сцягам партыі Леніна—Сталіна яны будуць у далейшым будаваць сваё новае шчаслівае жыццё.

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ. ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б. САКАВІК 1940 г. № 6

Бліскучая перамога сталінскай палітыкі міра

12 сакавіка г. г. у Маскве падпісан мірны дагавор паміж Совецкім Саюзам і Фінляндскай рэспублікай. Згодна дагавора 13 сакавіка ў 12 гадзін дня былі спынены ваенныя дзеянні і мір уступіў у свае правы. Совецка-Фінляндскі дагавор поўнасцю забяспечвае безапаснасць нашых паўночна-заходніх дзяржаўных граніц і ліквідуе адзін з небяспечных ачагоў вайны каля горада Леніна.

Мірны дагавор устанаўлівае новую граніцу паміж Совецкім Саюзам і Фінляндыяй. Згодна артыкула другога дагавора ў склад тэрыторыі СССР ўключаецца ўвесь Карэльскі перашэек з горадам Выбаргам і Выбаргскім залівам, заходняе і паўночнае ўзбярэжжа Ладажскага возера з гарадамі Кексгольмам, Сартавала, Суаярві, рад астравоў у Фінскім заліве, тэрыторыя на ўсход ад Меркярві з горадам Куалаярві, частка поўастравоў Рыбачага і Сярэдняга. Згодна артыкула IV Мірнага дагавора Фінляндыя згадзілася здаць Совецкаму Саюзу ў арэнду тэрмінам на 30 год поўвостраў Ханко з сумежнымі з ім астравамі для стварэння там ваенна-марской базы, здольнай абараняць ад агрэсіі ўваход у Фінскі заліў. Совецкаму Саюзу ў мэтах аховы гэтай ваенна-марской базы прадастаўляецца права трымаць там неабходную колькасць наземных і паветраных узброеных сіл.

На сваім Паўночным узбярэжжы Фінляндыя абавязваецца, як гэта было прадугледжана дагаворам 1920 года, не рабіць ваенных партоў, а таксама не трымаць у гэтых водах ваенныя і другія ўзброеныя судны акрамя дробных адзінак. Совецкаму Саюзу прадастаўлена права свабоднага транзіта праз абласць Петсамо ў Нарвегію і назад, як і права транзіта тавараў паміж СССР і Швецыяй.

У артыкуле III указана: «Абедзве дагаварваючыяся краіны абавязваюцца ўзаемна ўстрымлівацца ад усякага нападу адна на адну і не заключаць якіх-небудзь саюзаў ці ўдзельнічаць у кааліцыях (аб'яднанне супроць якіх-небудзь дзяржаў), накіраваных супроць адной з дагаварваючыхся старон». Гэты артыкул дагавора сведчыць аб тым, што Совецка-Фінляндскі дагавор, па сутнасці, з'яўляецца адначасова і дагаворам аб ненападзе. Такія асноўныя ўмовы Мірнага дагавора.

Верны задачам сваёй мірнай палітыкі совецкі ўрад яшчэ ўвосень мінулага года прапанаваў Фінляндыі адсунуць Совецка-фінскую граніцу на Карэльскім перашэйку на некалькі дзесяткаў кіламетраў на поўнач ад Ленінграда, узамен чаго Фінляндыі была прапанавана перадача часткі тэрыторыі Совецкай Карэліі. Аднак, былы ўрад Каяндэра—Эрко, пад націскам англа-французскіх імперыялістаў, адхіліў совецкія прапановы, якія адказвалі інтарэсам безапаснасці абодвух дзяржаў. Разлічваючы на абяцаную «дапамогу» з боку англа-французскіх імперыялістаў плутакратычны ўрад Каяндэра—Эрко пачаў вайну замест мірнага і разумнага ўмацавання адносін са сваім вялікім суседам.

Не прайшло і трох месяцаў як фінляндскі ўрад, у рэзультаце сакрушальнага ўдара гераічнай Чырвонай Арміі і Флота, вымушан быў адмовіцца ад сваёй авантуры.

Палітыка англа-французскіх падпальшчыкаў вайны на паўночным усходзе Еўропы пацярпела крах. Наперакор падпальшчыкам вайны Совецкі Саюз забяспечыў сілай тую безапаснасць сваіх граніц, якой ён не па сваёй віне не мог дабіцца ў мірных перагаворах. Цяпер поўнасцю забяспечана безапаснасць нашых паўночных граніц, безапаснасць велізарнейшага ў свеце рабочага цэнтра—Ленінграда, горада Мурманска і Мурманскай чыгункі. Доблесная Чырвоная Армія, выконваючы волю совецкага народа, прарвала і знішчыла «лінію Манергейма» з яе жалезабятоннымі ўмацаваннямі, пабудаванымі на сродкі і пры дапамозе замежных імперыялістаў і іх генеральных штабаў. Чырвоная Армія і Чырвоны Флот яшчэ раз паказалі ўсяму свету, што няма такіх крэпасцей, якіх не маглі-б узяць большэвікі.

Разбіўшы белафінскія цвярдыні, адданыя сыны Радзімы, адважныя воіны краіны соцыялізма сталі цвёрдай нагой на Карэльскім перашэйку, ператварыўшы яго з ударнага кулака супроць Ленінграда ў мірную совецкую тэрыторыю. Ліквідаван адзін з небяспечнейшых ачагоў вайны, які замежныя імперыялісты годамі ствараліі на фінляндскай тэрыторыі, падрыхтоўваючы вайну супроць Совецкага Саюза і разлічваючы запаліць ваенны пажар на ўсім Скандынаўскім поўвостраве.

Мірныя перагаворы паміж СССР і Фінляндыяй як вядома працягваліся ўсяго шэсць дзён. Такая кароткатэрміновасць перагавораў тлумачыцца тым, што з абодвух дагаварваючыхся бакоў было праяўлена імкненне ўлічыць інтарэсы ўзаемнай безапаснасці ў сучаснай складанай міжнароднай абстаноўцы.

Совецкаму Саюзу пры гэтым не прышлося мяняць сваіх пазіцый. Наша краіна на працягу ўсяго перыяда існавання совецкай улады заўсёды адносілася з павагай да дзяржаўнага суверэнітэта Фінляндыі. Аб гэтым яшчэ раз з усёй сілай і на ўвесь свет заявіў тав. Молатаў у сваёй прамове па радыё 29 лістапада 1939 года.

«Мы лічылі Фінляндыю,—гаварыў таварыш Молатаў,—які-б там рэжым не існаваў, незалежнай і суверэннай дзяржавай ва ўсёй яе знешняй і ўнутранай палітыцы. Мы стаім цвёрда за тое, каб свае ўнутраныя і знешнія справы рашаў сам фінляндскі народ, як гэта ён сам лічыць патрэбным».

Заключаны мірны дагавор, замацоўвае гэту павагу да Фінляндыі, як да незалежнай і суверэннай дзяржавы. Совецкаму Саюзу чужды якія-небудзь заваёўчыя тэндэнцыі і ўшчамленне дзяржаўнага суверэнітэта. Іменна дзякуючы гэтым акалічнасцям і было так хутка дасягнута мірнае пагадненне.

Мірны дагавор паміж СССР і Фінляндыяй адкрывае шырокія перспектывы для ўстанаўлення нармальных эканамічных сувязей паміж абодвума дзяржавамі. Дагаворам прадугледжана заключэнне новага гандлёвага пагаднення, якое, як паказвае вопыт заключаных гандлёвых дагавораў з

прыбалтыйскімі краінамі, можа пладатворна адбіцца на развіцці фінляндскага гандлю. Заключыўшы мірны дагавор з Совецкім Саюзам, Фінляндыя тым самым уключаецца ў групу краін, якія зацікаўлены ў захаванні міра і добрасуседскіх адносін з Совецкім Саюзам.

Гэтыя акалічнасці садзейнічаюць умацаванню міра ва ўсходняй Еўропе, асновы якога пакладзены заключэннем дагавора аб ненападзе і дружбе з Германіяй і дагаворамі аб узаемадапамозе з прыбалтыйскімі краінамі: Эстоніяй, Латвіяй і Літвой.

Совецка-Фінляндскі дагавор з'яўляецца новай бліскучай перамогай Сталінскай палітыкі міра. Ён сустрэт усім совецкім народам з пачуццём глыбокай радасці і выклікаў новую хвалю палітычнага ўздыма ва ўсім Совецкім Саюзе.

Совецкі народ ніколі не быў варожым да фінляндскага народа. Ён добра разумее, што Фінляндыя была ўцягнута ў вайну з Совецкім Саюзам англа-французскімі імперыялістамі, якія прызвычаены заграбаць жар чужымі рукамі.

Аднак, сакрушальныя ўдары Чырвонай Арміі хутка рассеялі маючыеся ў некаторых фінляндскіх палітыкаў ілюзыі наконт «дапамогі» звонку. Урад Рюці, змяніўшы пачаўшы вайну з СССР урад Каяндэра—Эрко, змог нарэшце правільна ацаніць склаўшаеся становішча Фінляндыі і зрабіць адпаведныя вывады.

Падпальшчыкі вайны пацярпелі жорсткае палітычнае паражэнне. Совецка-Фінляндскі дагавор выклікаў глыбокую радасць працоўных усіх краін, усяго перадавога чалавецтва, якое бачыць у Совецкім Саюзе несакрушальны аплот міра.

Совецкі Саюз вядзе сваю самастойную палітыку. Ён не хоча ўдзельнічаць у сутычках імперыялістычных дзяржаў і не дазволіць сябе ўцягнуць у вайну, якая нясе працоўным усіх краін незлічоныя няшчасці. Совецкая палітыка заўсёды была, ёсць і будзе палітыкай міра.

«А тыя паны, памутнены розум якіх перашкаджае ім бачыць Совецкі Саюз такім, які ён ёсць у сапраўднасці, нязменна будуць атрымоўваць прадметныя ўрокі да таго часу, пакуль яны не зразумеюць, што вялікі народ Советаў мае і заўсёды будзе мець сваю вялікую і страшную ў барацьбе з ворагам узброеную сілу, якая будзе знішчаць заўсёды і ўсіх, хто адважыцца пасягаць на свяшчэнныя правы, зямлю і гонар пабеданоснага Совецкага Саюза». (Варашылаў.)

Мір таржаствуе на ўсіх граніцах Совецкага Саюза. Совецкі народ спакойна і ўпэўнена будуе магутны і непераможны будынак комунізма. Ва ўсім гэтым ён абавязан сваёй гераічнай Чырвонай Арміі, памяць аб подвігах якой будзе вечна жыць у сэрцах совецкага народа. Ён абавязан гэтым мудрай і цвёрдай Сталінскай палітыцы міра, свайму ўраду, які ніколі не паступіцца інтарэсамі Совецкага народа, яго шчаслівым і радасным жыццём і заўсёды зможа настаяць на сваім для справы міра і спакоя Совецкай Краіны.

Натхнёныя высокай узнагародай за праяўленую доблесць і гераізм у барацьбе з фінскай белагвардзейшчынай байцы, камандзіры і палітработнікі гераічнай Чырвонай Арміі будуць і далей мацаваць баявую магутнасць, удасканальваць сваю зброю, павышаць баявую і палітычную падрыхтоўку. Багатыя вопытам прайшоўшых баявых сражэнняў, яны будуць і далей паказваць прыклады беззаветнай любві і адданасці сваёй Радзіме, совецкаму ўраду, большэвіцкай партыі, вялікаму правадыру і настаўніку працоўных усіх краін—любімаму Сталіну.

Батальённы камісар А. А. Любімаў.

20 сакавіка працоўныя Ленінграда сустракалі звярнуўшыхся з фронта байцоў—лыжнікаў, якія доблесна змагаліся на Карэльскім перашэйку. На здымку: Байцы-лыжнікі ў Ленінградзе. Фота М. Янова (ТАСС).

Адабраем палітыку совецкага ўрада

Рабочыя, служачыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі шчотачнай фабрыкі імені Крупскай сабраліся на мітынг, прысвечаны заключэнню Мірнага дагавора паміж Совецкім Саюзам і Фінляндыяй.

Выступаючыя на мітынгу рабочыя і служачыя горача віталі большэвіцкую партыю і совецкі ўрад, які няўхільна праводзіць палітыку міра.

— Мы адабраем Мірны дагавор,—гаворыць работніца т. Гутман,—заключаны паміж Совецкім Саюзам і Фінляндыяй. Дзеянні Чырвонай Арміі паказалі, што няма такіх крэпасцей, якіх не магла-б узяць Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія. Падпісаннем Мірнага дагавора з Фінляндыяй мы забяспечылі бяспаснасць нашых паўночна-заходніх граніц і горада Леніна.

У прынятай на мітынгу рэзалюцыі гаворыцца:

«Заслухаўшы паведамленне аб заключэнні Мірнага дагавора паміж Совецкім Саюзам і Фінляндыяй агульны сход адабрае палітыку совецкага ўрада. Совецкі народ таржаствуе яшчэ адну буйную перамогу, заваяваную пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і яе мудрага правадыра таварыша Сталіна.

Гэта велізарнейшая перамога заваявана дзякуючы гераічнай Чырвонай Арміі на чале з любімым Маршалам Совецкага Саюза Клімантам Ефрэмавічам Варашылавым. Няма ў свеце такой арміі, якая-б стаяла на стражы інтарэсаў народа, як наша Чырвоная Армія.

Заключэнне Мірнага дагавора паміж Совецкім Саюзам і Фінляндыяй яшчэ раз паказала ўсяму свету мудрасць мірнай палітыкі Совецкага Саюза. У адказ на палітыку міра нашага совецкага ўрада мы яшчэ больш будзем працаваць над умацаваннем абароназдольнасці нашай краіны. Яшчэ энергічней будзем разгортваць стаханаўскі рух і дабівацца новых поспехаў у ажыццяўленні гістарычных задач, пастаўленых таварышам Сталіным на XVIII з'ездзе партыі.

Няхай жыве мірная палітыка совецкага ўрада!

Няхай жыве наша любімая гераічная доблесная Чырвоная Армія!

Няхай жыве наш любімы сталінскі нарком таварыш Варашылаў!

Няхай жыве вялікі мудры правадыр працоўных усяго свету таварыш Сталін!

ПАДПАЛЬШЧЫКІ ВАЙНЫ ПРАЛІЧЫЛІСЯ

Планы правакатараў вайны яшчэ раз пацярпелі крах. Дарога да калыбелі рэволюцыі—горада Леніна—з мора і з сушы для іх закрыта назаўсёды. Увесь свет наглядна ўпэўніўся ў сіле і магутнасці нашай Чырвонай Арміі і Чырвонага Ваенна-Марскога Флота. У далёкіх манголь-скіх стэпах, каля ракі Халхын—Гол, совецкія войскі разбілі ворага, які імкнуўся напасці на граніцы дружаственай нам Манголь-скай Народнай Рэспублікі. Па загаду совецкага ўрада Чырвоная Армія вызваліла 13 мільёнаў беларусаў і украінцаў ад панскага гнёта.

Толькі дзякуючы вернай палітыцы партыі і совецкага ўрада заключан Мірны дагавор паміж Совецкім Саюзам і Фінляндыяй. Поўная перамога нашай доблеснай Чырвонай Арміі ў барацьбе з ворагамі совецкай дзяржавы забяспечана таму, што ёй кіруе вялікі Сталін. Высокімі ўзнагародамі—ордэнамі Совецкага Саюза адзначаны байцы, камандзіры і палітработнікі, а таксама цэлыя воінскія часці, праявіўшыя гераізм і адвагу ў барацьбе з ворагамі. Нямала гераізма праявілі ў баях нашы жанчыны.

«За радзіму!» «За Сталіна!»—з гэтымі словамі ішлі ў бой.

Калі я слухала па радыё радасную вестку аб заключэнні Мірнага дагавора, мне хацелася ў той час быць сярод нашых доблесных байцоў, палітработнікаў, паціснуць ім моцна рукі і сказаць ад усяго шчырага сэрца: «Вялікае дзякуй, таварышы!», пажадаць ім добрага здароўя і доўгіх, доўгіх год жыцця.

Мы, рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі станка-будаўнічага завода імені Кірава, яшчэ энергічней будзем працаваць на сваіх пастах, памятаючы, што наша стаханаўская работа дапамагае Чырвонай Арміі забяспечыць перамогу.

Р. Нахмановіч—інжынер механік.

Мінск.

Група комсамольцаў-актывістаў абароннай работы 26-й Бабруйскай сярэдняй школы. Злева—направа: М. М. Нісенбаум, З. Г. Іомдзін, М. Ю. Глускін і С. М. Міньковіч.

Фота М. Шкляра (Фотахроніка БЕЛТА).

Жанчыны ордэнаноснага калгаса

Перадавому калгасу Аршанскага раёна «Чырвоны бераг»—удзельніку Сельскагаспадарчай выстаўкі, Галоўным выставачным камітэтам прысуджан дыплом першай ступені, прэмія 10 тысяч рублёў і легкавая машына. За вялікія поспехі і дасягненні ў галіне сельскай гаспадаркі калгас атрымаў высокую ўзнагароду і ад совецкага ўрада—ордэн «Знак почета». Гэта ўзнагарода натхняе калгаснікаў на яшчэ лепшую работу.

Выдатныя поспехі ў рабоце інтэрнацыянальнага калгаса дасягнуты дзякуючы ўпартай барацьбе за высокі ўраджай з боку ўсіх калгаснікаў. Вялікая доля ў гэтых поспехах належыць жанчынам. На ўсіх адказных участках—у паляводчых брыгадах, гародных звеннях, на фермах у калгасе працуюць жанчыны—калгасніцы.

Сярод стаханавак калгаса лепшыя водгукі можна пачуць аб Веры Андрэеўне Саковіч. Не гледзячы на свае 56 год, яна працуе значна лепш многіх маладых. На любым участку работы—на праполцы, уборцы, у парніках, яе заўсёды можна бачыць уперадзе. Вера Андрэеўна сама працуе самаддана і вядзе за сабой уперад астатніх калгасніц. У мінулым годзе яна выпрацавала 382 працадні.

Тав. Саковіч не толькі стаханаўка калгаснай вытворчасці, але і выдатны грамадскі дзеяч. Яна бяззменны член праўлення калгаса, дэпутат Пішчалаўскага сельскага совета дэпутатаў працоўных. Кожны год тав. Саковіч прэміруюць за выдатную работу. У мінулым годзе Веру Андрэеўну прынялі кандыдатам у члены КП(б)Б.

Тав. Саковіч нястомна змагаецца за высокі ўраджай, за ўнядрэнне перадавой агратэхнікі і стаханаўскіх метадаў работы. Ураджай у 350—400 цэнтнераў гародніны ёю ужо заваёван. Зараз гароднае звяно змагаецца за атрыманне 500 цэнтнераў кораняплодаў і капусты, 450 цэнтнераў гуркоў з гектара.

Паказальна работа загадчыцы свінатаварнай фермы калгаса Анны Станавой. У 1938 годзе Станавая атрымала ў сярэднім па 14,2 парасяці ад кожнай свінаматкі, а ў 1939 годзе—па 17,7 дзелавога парасяці. У гэтым годзе не толькі тав. Станавая, а і ўсе работнікі фермы змагаюцца за атрыманне ад кожнай свінаматкі не менш, як па 22 дзелавых парасяці.

За высокія паказчыкі на свінатаварнай ферме Анна Станавая залічана кандыдатам на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку. Яна прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці калгаса, з'яўляецца членам праўлення.

Тав. Станавая сумяшчае работу загадчыцы фермы з работай свінаркі. Праца яе высока аплачваецца. У мінулым годзе яна разам са сваім мужам, таксама кандыдатам на Усесаюзную выстаўку, звеннявым выпрацавалі 928 працадзён, на якія атрымалі 4 547 рублёў грашыма, 102 пуды хлеба, 245 пудоў бульбы, 167 пудоў гародніны і іншыя прадукты.

Сям'я тав. Станавой жыве заможна і культурна. У кватэры яе ёсць такія дарагія рэчы, як нікеліраваныя ложкі, шафы, дыван, швейная машына і т. д. Толькі ў гэтым годзе сям'я Станавой купіла розных каштоўных рэчаў і адзення на 3 тысячы рублёў...

Сярод стаханавак малочна-таварнай фермы калгаса таксама выдзяляюцца даяркі Таццяна Хаецкая, Саша Войтава, цялятніца Іта Хасман.

У барацьбе за высокі ўраджай і высокую прадукцыйнасць працы ў калгасе значна праявіла сябе калгасніца-стаханаўка трэцяй палявой брыгады Міхаліна Сенькоўская. На працягу ўсяго года разам з мужчынамі працуе яна на самых складаных сельскагаспадарчых работах. Тав. Сенькоўская з'яўляецца кандыдатам у члены КП(б)Б.

Памятаючы ўказанні таварыша Молатава жанчыны ордэнаноснага калгаса самаддана працуюць на сваім пасту. Іх стаханаўская вытворчая і грамадская работа яскрава пацвярджае словы мудрага правадыра таварыша Сталіна аб тым, што жанчына ў калгасе—вялікая сіла.

Э. Каган.

Аршанскі раён.

Лепшая даярка калгаса „Рассвет" (Жлобінскі раён, Гомельскай вобласці) Д. Я. Валчкова з каровай „Малінаўка", ад якой яна дабілася ўдоя малака 11—13 літраў у суткі. Тав. Валчкова ў 1939 годзе выпрацавала 570 працадзён. Фота Б. Марціёнка (Фотахроніка БЕЛТА).

Былы інспектар Мехаўскага аддзялення дзяржбанка (Віцебская вобласць) П. Ф. Патоцкая вылучана на пасаду дырэктара аддзялення Дзяржбанка.

На здымку: Тав. Патоцкая прымае старшыню Зайкоўскага сельсовета тав. Дудкіна.

Фота Б. Хеніна (Фотахроніка БЕЛТА).

Падрыхтавана сустракаем вясну

Я працую ўчастковым аграномам, абслугоўваю 9 калгасаў. 1939 год хаця і быў неспрыяючым па кліматычных умовах, але ўсё-ж большасць калгасаў майго ўчастка атрымалі ўраджай вышэйшы ў параўнанні з мінулымі годамі. Напрыклад калгасы «Чырвоны барэц», «Інтэрнацыянал», імені Валадарскага атрымалі з кожнага гектара па 40 цэнтнераў канюшыны, 150—160 цэнтнераў бульбы. Гэтыя калгасы былі ўдзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

У мінулым годзе ў калгасах майго ўчастка працавалі толькі звенні высокіх ураджаяў, а пастаянных не было. Сёлета, па прыкладу соцень калгасаў чарназёмнай паласы, мы таксама рашылі перайсці да працы ў пастаянных звеннях.

У кожным калгасе ў брыгадах ужо арганізаваны пастаянныя звенні. За звеннямі замацаваны адпаведныя культуры, інвентар, цягавая сіла.

Ужо зараз звенні ведаюць, дзе іх участкі і што трэба сеяць. У кожным з іх складзены агратэхнічныя планы. Паміж звеннямі, брыгадамі і калгасамі майго ўчастка заключаны соцдагаворы. Калгаснікі спаборнічаюць за поўнае выкананне сталінскага лозунга—даць краіне штогод 7—8 мільярдаў пудоў хлеба і змагацца за атрыманне 100 пудоў зярна з кожнага гектара.

Мы правялі 7-дзённыя курсы звеннявых. Не гледзячы на моцныя завеі і маразы, штодзённа з далёкіх і блізкіх калгасаў прыязджалі звеннявыя на заняткі ў МТС.

Пасля курсаў, не адкладаючы ні аднаго дня, звеннявыя разам са сваімі звеннямі разгарнулі падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Насенне, ачышчанае яшчэ з восені, ачысцілі ў другі раз. Таксама паўторна паслалі насенне на аналіз.

Якое-б не было добрае насенне, але калі яго пасеяць на няўгноенай глебе, ураджай будзе нізкі. Улічваючы гэта, мы вывезлі зімою на поле гной і торф. У тых калгасах, дзе няма торфу, вывозяць адзін толькі гной. Каб гной не псаваўся, яго складаюць у ярусы, моцна ўтрамбоўваюць і перасыпаюць снегам. Попел збіраюць у кожным калгасе. Акрамя мясцовых угнаенняў калгасы завозяць і мінеральныя угнаенні.

У гэтым годзе нашы дзве хаты-лабараторыі правялі вопыт снегазатрымання на азімым жыце і канюшыне.

Вясну 1940 года калгасы майго ўчастка сустрэнуць упаўне падрыхтаванымі. Спадзяюся, што сёлета з ліку гэтых калгасаў будзе значна больш удзельнікаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, чым у мінулым годзе.

Аграном Ніна Нарэйко.

Асіпавіцкі раён.

Тав. Нарэйко за падрыхтоўкай якаснага зярна да вясны.
Фота Я. Салавейчыка.

ТАРФЯНІЦА

Вясной у 1934 годзе ў калгас імені Леніна, Якаўлеўскага сельсовета, Аршанскага раёна прыехаў прадстаўнік Асінторфа для вярбоўкі рабочай сілы на торфзавод. На сходзе калгаснікаў Екацерына Сямёнаўна Мядзведзева—стаханаўка па догляду свіней заявіла аб сваім жаданні працаваць на торфзаводзе і калгас задаволіў яе просьбу.

На заводзе спачатку тав. Мядзведзева працавала на сушцы торфа. Неўзабаве яе прызначылі брыгадзірам. Тры годы падрад брыгада Екацерыны Сямёнаўны з'яўляецца перадавой і ўвесь час трымае пераходны чырвоны сцяг. За час работы на торфзаводзе т. Мядзведзева падрыхтавала нямала майстроў тарфяной справы. Усе свае веды і багаты вопыт работы яна з ахвотай перадае маладым работніцам. Брыгада т. Мядзведзевай у мінулым годзе перавыканала ўстаноўленыя нормы ў два разы. У некаторыя дні брыгада выконвала план на 250—300 процантаў.

Выбаршчыкі Асінторфскай выбарчай акругі № 19 аднадушна выбралі Екацерыну Сямёнаўну Мядзведзеву сваім дэпутатам у Аршанскі раённы Совет дэпутатаў працоўных.

г. Орша **М. Каласоўскі.**

НОВАЕ Ў ВЁСЦЫ

Нарадзілася я 39 год таму назад у беднай сялянскай сям'і. Рана пазнала гора і нястачы. Маладой выдалі мяне замуж. І пацякло горкае, як палын, жыццё. Зямлі мелі толькі 2 гектары. Свайго хлеба ніколі не хапала да вясны. Ад рання да цёмнай ночы прыходзілася працаваць у памешчыка, каб мець кавалак чорнага хлеба. Серп і матыга былі маімі братам і сястрой, а голад і холад былі спадарожнікамі майго жыцця. На сваіх плячах я перанесла цяжкі гнёт паноў-крывапійцаў.

Шукаючы выхаду з цяжкага становішча, я прымала ўдзел у падпольнай рабоце. Не адзін раз мяне праследавала паліцыя і арыштоўвала, але я не спыняла сваёй работы.

Вераснёўскія дні мінулага года застануцца памятнымі на ўсё маё жыццё. Чырвоная Армія прынесла нам свабоду і вызваленне. З гэтых дзён пачалася мая актыўная грамадская дзейнасць. Сярод насельніцтва я праводзіла агітацыйна-масавую работу. У часе выбараў у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі была членам Участковай выбарчай камісіі.

У нашай вёсцы арганізаваны курсы для непісьменных і малапісьменных, на якіх займаецца 125 чалавек. У лістападзе мяне паслалі на курсы старшынь сельсоветаў. Пазнаўшы многа новага на курсах, з новымі ведамі я смела ішла ў масы і праводзіла агітацыйную работу сярод сялян сваёй вёскі Новаволя. Аднаго разу падыйшлі да мяне сяляне і кажуць: «А што, каб мы ў сваёй вёсцы арганізавалі калгас». Іх ініцыятыву я падтрымала. Назаўтра 38 чалавек далі згоду запісацца ў калгас. Адразу зрабілі сход калгаснікаў. На першым-жа сходзе далі новаарганізаванаму калгасу імя нашага вызваліцеля, бацькі і настаўніка, друга ўсіх працоўных таварыша Сталіна.

На сходзе мы прапрацавалі статут сельскагаспадарчай арцелі. Усе калгаснікі з вялікай увагай і адабрэннем выслухалі статут і адразу-ж абралі праўленне калгаса з 9 чалавек. На пасяджэнні праўлення калгаса размеркавалі паміж сабой абавязкі. Мяне выбралі старшынёй калгаса. Цяпер у нашым калгасе налічваецца 125 гаспадарак.

Не ўсе сяляне, уступіўшыя ў калгас, мелі жывёлу, інвентар. Нам аддалі кароў, свіней, сена, салому былых асаднікаў. Цяпер у калгасе 16 дойных кароў. Двух жанчын паставілі даяркамі. Ёсць у нас начны вартаўнік, конюх, дзве свінаркі.

Калгаснікі добраахвотна абагулілі, хто меў, плугі, бароны, насенне. Зрабілі спіс інвентара і вызначылі адказнага за яго. Вёску, у якой знаходзіцца калгас, разбілі на чатыры ўчасткі і да кожнага ўчастка прымацавалі члена праўлення, які сочыць за ўсімі сельскагаспадарчымі работамі. Я ўпэўнена, што наш калгас зойме першае месца па арганізацыі і падрыхтоўцы да першай совецкай вясны.

Народ аказаў мне вялікае давер'е—мяне абралі дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР. Гэта высокае давер'е пастараюся апраўдаць сваёй чэснай і адданай работай.

Е. Ф. Максімюк.

Беластоцкая вобласць,
Заблудаўскі раён.

24 сакавіка—у дзень выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, вызваленыя працоўныя заходніх абласцей Беларусі адзінадушна галасавалі за лепшых сыноў і дачок соцыялістычнай радзімы, кандыдатаў Сталінскага блока камуністаў і беспартыйных.

На здымку: У шэсць гадзін раніцы на 120-м выбарчым участку ў вёсцы Вацечкі, Беластоцкага раёна. Фота І. Рабіновіча (Фотахроніка БЕЛТА).

Студэнткі-выдатніцы Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі і Мінскага музычнага вучылішча. На здымку злева направа: Кауфман, Запольская, Тупчынка.

Фота Я. Салавейчыка.

Заклікаем трактарыстак звярнуцца на трактар

На працягу чатырох месяцаў мы вучымся на курсах трактарыстаў пры Копыскай МТС. Упершыню прыходзіцца знаёміцца з трактарам.

Побач з тэарэтычнымі заняткамі вялікая ўвага ўдзяляецца практычнаму вывучэнню асобных складаных частак трактара ў майстэрні МТС. Практыкай кіруе механік Красоўскі, які ўважліва адносіцца да сваёй работы, зацікаўлен тым, каб курсанты добра авалодалі трактарам. Мы прымаем удзел у правядзенні рамонта трактароў, а курсантка Ніна Валодчанка на працягу ўсёй рамонтнай кампаніі працуе па рамонту. На аснове практычнага вывучэння яна рыхтуецца стаць трактарысткай.

Усе мы ведаем, якая адказная работа стаіць перад намі ў барацьбе за сталінскі ўраджай, за наша заможнае калгаснае жыццё. Вялікую ролю ў гэтай барацьбе адыгрывае трактарная апрацоўка глебы. У прадстаячую веснавую сяўбу работы будуць асабліва напружанымі. План зяблівага ворыва ў нашых калгасах няпоўнасцю выканан, і для таго, каб высокаякасна апрацаваць глебу, патрабуюцца вялікія намаганні.

Набліжаецца час выезду ў поле. К гэтаму тэрміну мы абавязаліся скончыць курсы на «добра» і «выдатна». Добра авалодаўшы трактарнай справай, мы будзем змагацца за высокі сталінскі ўраджай. Калі патрабуецца, заменім руль трактара на баявую машыну—танк.

У нашым раёне ёсць нямала дзяўчат, якія раней працавалі прыцэпшчыцамі, і паспяхова скончыўшы курсы трактарыстаў, на трактарах не працуюць. Відаць яны недаацэньваюць вялікую важнасць работы жанчын на трактары, баяцца больш складанай работы. З боку нашай МТС, а таксама астатніх трох машына-трактарных станцый раёна не было звернута дастаткоковай ўвагі, каб скласці трактарысткам адпаведныя ўмовы для работы.

Заклікаем усіх трактарыстак у надыходзячую вясну прыступіць да работы на трактары, паказаць высокі клас стаханаўскай работы. Заклікаем дзяўчат працаваць прыцэпшчыцамі, авалодаць трактарнай справай.

Разам з намі на курсы трактарыстак паступілі дзяўчаты Дуня Спішчава, Антаніна Магер, Вера Васільева і Дуня Крыштон. Яны правучыліся некаторы час і кінулі курсы. Іх учынак мы лічым непрыстойным, няправільным. Ён заслугоўвае ўвагі грамадскасці.

Курсанткі Копыскай МТС: Ніна Пазнякова, Ольга Казлова, Надзя Сідаровіч, Ніна Агеева, Маша Скарынка.

Кожнаму калгасу—узорныя яслі

Набліжаецца вясна. Хутка ў калгасах і соўгасах Беларусі пачнецца пасеўная кампанія. Тысячы жанчын-калгасніц разам з мужчынамі выйдуць у поле на сельскагаспадарчыя работы. Ад іх актыўнай работы, ад іх удзелу ў значнай ступені залежыць паспяховае правядзенне пасеўнай кампаніі.

У справе поўнага ўцягнення жанчын да ўдзела ў пасеўнай кампаніі і падняцці прадукцыйнасці іх працы рашаючае значэнне маюць яслі. Добра арганізаваныя калгасныя яслі дапамогуць разгортванню стаханаўскіх метадаў працы сярод жанчын на калгасных палях.

Колькі няшчасцяў было з дзецьмі ў старой царскай вёсцы ў часе палявых работ, калі дзяцей прыходзілася пакідаць адных на вуліцы без усякага догляду. Яны валяліся ў пылу, брудзе, галодныя. Толькі пры совецкай уладзе, клопатамі нашага вялікага Сталіна зусім па-другому арганізавана жыццё ў нашых калгасах і ў першую чаргу жыццё працоўных жанчын-мацярэй. Яслі, кансультацыі, дзіцячыя пляцоўкі, радзільныя дамы, водпускі па цяжарнасці, дапамога па многасямейнасці і другія мерапрыемствы па ахове мацярынства і дзяцінства забяспечаны Сталінскай Канстытуцыяй і сталі дзяржаўным законам.

У радзе калгасаў БССР ўзорна пастаўлена работа сезонных ясляў, садоў. Вось напрыклад калгас «Чырвоны барацьбіт», Мінскага раёна. Тут для дзіцячых ясляў пабудавана спецыяльнае памяшканне прасторнае, светлае, з чатырох пакояў. У яслях штодзённа бывала 40 дзяцей калгасніц. За прыкладную і старанную работу загадчыца ясляў т. Ронцко Вікця прэміравана.

Таксама добра пастаўлена работа сезонных ясляў у калгасе імені Калініна, Крупіцкага сельсовета, Мінскага раёна. Загадчыца яслямі т. Шакуро ўзорна паставіла работу. Праўленне калгаса добра забяспечвала дзяцей прадуктамі харчавання. Памяшканне абсталявана, закуплены цацкі. Мацеры-калгаснiцы вельмі ўдзячны за выхаванне іх дзяцей.

Але ёсць калгасы, дзе зусім мала ўдзяляюць увагі арганізацыі і забеспячэнню дзіцячых ясляў. У калгасе «Дружба», Калодзішчанскага сельсовета (Мінскі раён) было пабудавана спецыяльнае памяшканне для ясляў. Аднак яслі прапрацавалі не больш тыдня і праўленне калгаса закрыла іх. Памяшканне аддала ў арэнду дачнікам. Некаторыя калгасніцы ў выніку былі вымушаны спазняцца або зусім не выходзіць на работу. Настул у калгасах Калодзішчанскага сельсовета зусім мала ўдзяляецца ўвагі арганізацыі ясляў.

Самае галоўнае ва ўсёй гэтай справе — падбор ясельных работнікаў. Даверыць выхаванне дзяцей можна толькі лепшай, добра праверанай, чэснай калгасніцы. Няня і кухарка таксама павінны быць выдзелены з ліку надзейных, адданых калгасніц.

Амаль у кожным раёне арганізаваны і працуюць курсы па падрыхтоўцы ясельных работнікаў. На сённешні дзень па БССР на гэтых курсах займаецца 1892 чалавека. На курсы выдзелены перадавыя калгасніцы.

На жаль, далёка не ўсюды праўленні калгасаў сур'ёзна падыходзяць да гэтай справы. У Лоеўскім раёне 20 старшынь калгасаў не выдзелілі людзей на курсы па падрыхтоўцы ясельных работнікаў, а некаторыя праўленні калгасаў гэтага-ж раёна ясельных работнікаў скарыстоўваюць не па прызначэнню. Вось, напрыклад, у калгасе імені Сталіна (старшыня тав. Тарасенка) загадчыца дзіцячых ясляў працуе рахункаводам калгаса.

Жанчыны-калгасніцы павінны паставіць перад праўленнямі калгасаў пытанне аб неабходнасці арганізацыі ясляў на перыяд сельскагаспадарчых работ. Неабходна дабіцца таго, каб у кожным калгасе, дзе ёсць дзеці ясельнага ўзросту, былі арганізаваны яслі.

Калгасніцы-мацеры павінны ўважліва сачыць за ўсім жыццём і работай ясляў і дапамагаць ім. Толькі такім чынам можна дабіцца ўзорнай пастаноўкі работы ясляў, узорнага выхавання здаровых, жыццерадасных дзяцей, будучых будаўнікоў социялістычнага грамадства.

Н. Саевіч—начальнік аддзела лячэбна-прафілактычнай дапамогі дзецям Наркамздрава БССР.

Дзеці рабочых і служачых станкабудаўнічага завода імені С. М. Кірава—удзельнікі мастацкай самадзейнасці дзіцячага сада. Фота Я. Салавейчыка.

У ўрачэбным кабінеце 18 сярэдняй школы (Мінск). Фота Н. Анціпава (Фотахроніка БЕЛТА).

У г. Беластоку, у памяшканні, дзе раней жыў буйнейшы фабрыкант Беккер, адкрыты дзіцячыя шасцідзённыя яслі.
На здымку: Доктар-Ю. Б. Наралеўская ўзважвае Машу Гольдберг—дачку работніцы.

У 1-й дзіцячай больніцы горада Беластока. Дачка тэкстыльшчыцы чатырохгадовая Люся Капелек пасля выздараўлення.
Фота Д. Чэрнова (Фотахроніка БЕЛТА).



У рускай школе г. Беластока. На ўроку роднай мовы. Фота Д. Чэрнова (Фотахроніка БЕЛТА).

Тры пакаленні адной сям'і

Дзяцінства і юнацкія годы Веры Ільінішны былі цяжкімі і сумнымі. Яна ўспамінае, як дзесяцігадовай дзяўчынкай пакінула свой родны дом і пайшла да памешчыка ў прыслугі. Вера Ільінішна адчула і голад, і холад, і непасільную працу.

Калі цяпер уся сям'я Ахрамовічаў збіраецца разам, пачынае гутарку, то Вера Ільінішна не адстае ад дзяцей, жартуе, разам з імі весяліцца.

Вера Ільінішна вельмі шкадуе, што ёй ужо 53 годы. Жыць-жа яна пачала па-чалавеччы толькі пры совецкай уладзе.

Прыкладам велізарнага росту новых людзей Сталінскай эпохі можа служыць сям'я Ахрамовічаў. Вера Ільінішна калісьці і ў сне не бачыла, што яе дзеці будуць знатнымі людзьмі Совецкай краіны.

Усіх дзяцей у яе шасцёра. Дачка Ольга Пятроўна мае вышэйшую асвету і працуе цяпер кансультантам кіраўніцтва справамі Соўнаркома БССР. Да гэтага 12 год працавала яна ў Дзяржплане БССР. Скончыла Інстытут народнай гаспадаркі імені Куйбышэва і атрымала званне інжынера-планавіка.

Ольга Ахрамовіч актывістка. Яна прымала ўдзел у важнейшай дзяржаўна-палітычнай кампаніі—перапісе насельніцтва. За работу атрымала падзяку ад Соўнаркома СССР.

Тав. Ахрамовіч упарта працуе над сабой. Яна вельмі добра разумее, што кожны совецкі работнік, на якім-бы пасту ён ні стаяў, на якой-бы ён рабоце ні быў—павінен авалодаць асновамі марксізма-ленінізма. Сама Ольга Пятроўна вось ужо два годы, без адрыву ад работы, займаецца ў марксісцка-ленінскім універсітэце.

Братамі сваімі Ольга Ахрамовіч ганарыцца. Тры яе брата з'яўляюцца доблеснымі воінамі квітнеючай краіны соцыялізма. Два з іх па закліку партыі і совецкага ўрада са зброяй у руках змагаліся з фінскай белагвардзейшчынай.

* * *

Са школы прыбегла дванаццацігадовая Лена да сваёй бабулькі—Веры Ільінішны. Абняла яе і расказала, што атрымала выдатную адзнаку. Неўзабаве прышла шасцігадовая Зіна з дзіцячага сада. Наперабой унучкі расказвалі аб школе, аб дзіцячым садзе, аб сваіх занятках. Маленькая Зіна хвалілася бабульцы, што яна сама намаляавала спальны пакой свайго сада з ложкамі.

— Калі хочаце, я вам пакажу,—і не дачакаўшыся адказу яна дастала з сумачкі свой сшытак для малявання.

Вера Ільінішна любавалася малюнкамі Зіны, любавалася ўнукамі—сваім пакаленнем. Часам яна зайздросціць ім, іх шчаслівамў дзяцінству.

* * *

Тры пакаленні адной сям'і. Вера Ільінішна большую палову свайго жыцця пражыла ў голадзе, нішчаце, бяспраўі, беспрасветнай цемры.

Дзеці яе раслі разам з Совецкай краінай. Іх выхоўвала партыя, аб іх клапаціўся Сталін. Яны—знатныя людзі краіны Советаў.

І нарэшце шчаслівейшае пакаленне—ўнукі.

Усе яны растуць у Сталінскую эпоху, пад праменнямі Сталінскай канстытуцыі, якая асвятляе жыццёвы шлях старыкам, юнакам і дзецям.

Н. Старавойтава.

Старшыня калгаса імені Чапаева (Чашніцкі раён, Віцебскай вобласці) М. М. Падрэз і звеняявая гэтага калгаса М. І. Азява, узнагароджаная медаллю „За трудовое отличие". У мінулым годзе яны з'яўляліся ўдзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. У гэтым годзе таксама вылучаны для ўдзелу ў выстаўцы.

Фота В. Лупейка (Фотахроніка БЕЛТА).

Інтэлігенткі на рабоце

Мільёны людзей ў былой Польшчы былі бяспраўнымі. Калі-ж таму ці іншаму шчасліўцу і ўдавалася ўстроіцца на работу, то не па сваёй спецыяльнасці. Жанчына з медыцынскай асветай працавала парыкмахерам, інжынер-хімік—у фарбавальнай майстэрні, тэхнік—вартаўніком. Так марна траціліся свой час людзі, маючыя вышэйшую асвету. Між тым не лёгка набывалася гэта асвета, бо патрэбны былі сродкі на плату за вучобу, кватэру, харчы, праезд. Каб мець іх студэнты ў часе летніх канікулаў ішлі ў наймы да буржуяў. Перспектывы пасля вучобы былі не бліскучымі.

Толькі пры совецкай уладзе інтэлігенцыя заходніх абласцей БССР атрымала работу. Яе жыццё цяпер—жыццё шчаслівых грамадзян вялікага Совецкага Саюза. Яна не адчувае нацыянальнага гнёту. Палякі, беларусы, рускія, яўрэі, украінцы—усе працоўныя з'яўляюцца роўнапраўнымі грамадзянамі СССР. Вялікая Сталінская канстытуцыя забяспечыла і працоўную інтэлігенцыю правам на працу і вучобу.

Цяпер жанчыны-інтэлігенткі працуюць на ўсіх участках, займаюць розныя пасады. Настаўніца, артыстка, урач—кожная з іх адчувае адказнасць за сваю работу.

Вось Любоў Зусімовіч 22 годы была беспрацоўнай. Цяпер працуе ў канторы таварнай станцыі горада Брэста. Драмгоўская працуе настаўніцай. Зінаіда Вайтовіч працавала раней толькі некалькі тыдняў у год, а зараз яна тэлефаністка. Мажэйка—настаўніца 15 год была беспрацоўнай, цяпер працуе ў школе вёскі Токары. Яна з гонарам заяўляе, што абавязана Чырвонай Арміі за сваю шчаслівую старасць.

Цяжка пералічыць, якія пакуты пераносілі беспрацоўныя жанчыны пры панаванні польскай шляхты. Совецкая ўлада, вялікі Сталін улілі ў іх сілу і энергію. Яны ад душы ўдзячны нашай доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і роднаму бацьку таварышу Сталіну за сваё вызваленне, за сваё шчаслівае жыццё. **О. Кудраўцава**

Брэст.

Група работніц-вылучэнак горада Пінска.
Злева направа: М. А. Шапіра—намеснік старшыні абласнога камітэта Чырвонага крыжа, Р. І. Папцюшына—брыгардзір цэха фанернага завода № 4, Б. І. Замдвайс—майстар цэха, Л. З. Кушнер—майстар, Э. С. Ліўшыц—загадчык гасцініцай, В. Ф. Валейка—дырэктар упраўлення гасцініцамі і С. А. Розенберг—многастаночніца.

ЖАНЧЫНЫ ВУЧАЦЦА

Цяжкім быў лёс працоўных жанчын у былой панскай Польшчы. Яны былі забітымі, цёмнымі, непісьменнымі. Іх не лічылі за людзей. Жанчыны былі пазбаўлены магчымасці вучыцца. Толькі цяпер, пасля ўстанаўлення Совецкай улады на тэрыторыі Заходняй Беларусі, нястрымна вялікая прагнасць жанчын да вучобы, да ведаў. Яны імкнуцца да актыўнага грамадскага жыцця. Характэрны адзін эпізод, з якім мне прышлося сустрэцца. У вёсцы Камяніца—Журавецкая я бачыў як шасцідзесяцігадовая Пелагея Васілюк хутка збіралася кудысьці.

— Куды вы?—пытаюся я.

— Як-жа! На сход! Раней маёй справай было толькі дома сядзець, а цяпер і мне там пашана. Я там не лішняя.

Даволі сказаць, што толькі па раёнах Дамачэўскаму, Брэсцкаму, Высоцкаму, Маларыцкаму і Камянецкаму, Брэсцкай вобласці, налічваецца 16 216 непісьменных жанчын і 18 219 малапісьменных.

Зараз гэту вялікую армію працоўных трэба навучыць грамаце, зрабіць культурнымі ўдзельнікамі вялікага соцыялістычнага будаўніцтва. Пяці пералічаным раёнам па каштарысу народнай асветы прадугледжана на 1940 год 3 мільёна 436 687 рублёў. Па раёнах арганізавана больш 60 лікпунктаў, дзе ліквідуюць сваю непісьменнасць 5000 чалавек, сярод іх палова жанчын. У горадзе Брэсце працуюць курсы па падрыхтоўцы культармейцаў. На іх займаюцца 12 жанчын.

У былым панскім маёнтку вёскі Буяка, Косіцкай воласці, адкрыта школа. У ёй вучацца дзеці былых батракоў. На хутары Раманоўскіх у доме былога асадніка таксама адкрыта школа, у якой акрамя дзяцей увечары займаюцца дарослыя. Тут школу наведвае 12 жанчын. Асабліва выдзяляюцца сваімі здольнасцямі, паспяховасцю ў вучобе Ольга Юшук, Вера Макавецкая і другія.

Жанчын не толькі вучаць грамаце, але часта з імі правадзяць гутаркі аб краіне соцыялізма. З якой прагнасцю і увагай яны слухаюць расказы бяседчыкаў. Многа розных пытанняў узнікае ў іх у часе гутарак. Яны цікавяцца жыццём совецкіх жанчын, лепшымі людзьмі нашай краіны, вялікім і грандыёзным будаўніцтвам Совецкага Саюза.

М. Васілюк—
інструктар школы дарослых.

г. Брэст.

У гасцях у школьнікаў

Народная артыстка. Як многа цудоўнага і прыгожага сэнса ўкладзена ў гэтыя словы. Шырокія масы працоўных слухаюць і бачаць у выдатным выкананні народных артыстаў лепшыя літаратурныя і музычныя творы.

Сапраўдным прадстаўніком народнага мастацтва з'яўляецца дэпутат Мінскага абласнога Совета—народная артыстка рэспублікі Ларыса Пампееўна Александроўская. Яе мы сустракаем не толькі на сцэне Тэатра оперы і балета, але і ў воінскіх часцях, на прадпрыемствах, у ВНУ і школах.

Я раскажу аб той грамадскай рабоце, якую праводзіць т. Александроўская ў 11-й сярэдняй школе. Ларыса Пампееўна арганізавала рад канцэртаў у нашай школе. У арганізацыю гэтых канцэртаў яна ўкладае многа энтузіязма і зацікаўленасці. Яна хоча зрабіць вольны час дзяцей цікавым і вясёлым.

Да свята новагодняй ёлкі Ларыса Пампееўна асабліва многа папрацавала ў школе. Пры яе дапамозе артыст Вялікага тэатра т. Окунь арганізаваў дзіцячую самадзейнасць. Усе дзеці актыўна ўдзельнічалі ў гульнях і спевах. Потым для дзяцей быў дадзен канцэрт, у якім прынялі ўдзел вучні музычнай школы Зоя Сабалеўская, Ната Фаміна і Грэта Рубін. У канцэрце выступілі прафесар Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Савіцкі, артысты Навіцкі і Шэмельнік. Арганізатарам канцэрта была тав. Александроўская.

Дзеці, рассеўшыся цесным кругам вакол ёлкі, уважліва слухалі песні аб нашай радзіме, аб гераічнай Чырвонай Арміі ў выкананні народнай артысткі тав. Александроўскай. Гэты вечар застанецца надоўга ў памяці дзяцей.

У дзень шасцідзесяцігоддзя з дня нараджэння таварыша Сталіна ў школе былі праведзены ўрачыстыя зборы піонерскіх атрадаў. Рэбяты 3-га класа запрасілі на збор тав. Александроўскую. На гэтым зборы Ларыса Пампееўна так проста і задушэўна расказала дзецям аб сустрэчы з таварышом Сталіным у Крэмлі і аб сваім удзеле ў дэлегацыі ад працоўных БССР, якая ездзіла вітаць XVIII З'езд Камуністычнай Партыі. З вялікай увагай і любоўю слухалі рэбяты гэты задушэўны расказ аб любімым правадыру. У заключэнне Ларыса Пампееўна паабяцала быць частым госцем у школе.

Тав. Александроўская высока нясе званне народнай артысткі. Яна сапраўды блізка не толькі да дарослых, але і да дзяцей, якія яе горача палюбілі.

Елена Слабодкіна—загадчык навучальнай часткі школы № 11.

Мінск.

Да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. На здымку: Сцэна—свята ў калгасе з п'есы Э. Самуйленка „Пагібель ваўка" у пастаноўцы І Беларускага Дзяржаўнага Драматычнага Тэатра.

Фота М. Савіна (Фотахроніка БЕЛТА).

Старшы бракёр трыкатажнай фабрыкі імені 8-га сакавіка (Гомель), дэпутат гарадскога Совета дэпутатаў працоўных А. М. Лазоўская (справа) правярае якасць прадукцыі многастаночніцы Л. Л. Берлінай.

Фота А. Шаевіча (Фотахроніка БЕЛТА).

Стаханаўка будаўніцтва

Маладую энергічную дзяўчыну-стаханаўку будаўніцтва Мінскага радыёзавода Марусю Хамякову ведаюць усе рабочыя завода.

Хамякова былая работніца дрэваапрацоўчага завода імені Молатава. Лепшая стаханаўка, яна сістэматычна перавыконвала нормы і давала прадукцыю высокай якасці. Калі распачалося будаўніцтва радыёзавода Маруся першай з дзяўчат засталася работаць на будаўніцтве. Яе вызначылі брыгадзірам. Яна падабрала лепшых людзей у брыгаду і з новымі сіламі прыступіла да работы.

Дзе-б ні працавала брыгада Хамяковай усюды яна паказвае ўзоры работы, па-стаханаўску змагаецца за выкананне і перавыкананне вытворчых заданняў.

Яшчэ гадзіна да пачатку работы, а Маруся са сваёй брыгадай ужо на месцы. Яна атрымала дзённае заданне і прыступіла да работы. К канцу дня ў табелі з'яўляецца лічба 180 процантаў. Такую высокую прадукцыйнасць у рабоце брыгада дала на бетаніраванні балак у бетонным цэху. Пры норме ў 16 балак, яны бетаніруюць па 28 штодзённа.

Лепшыя людзі брыгады Н. Равенчык, П. Палешчук, М. Хамякова, Р. Альхімовіч і іншыя ўпершыню працуюць на гэтай рабоце. Аднак, яны стараюцца, як мага хутчэй скончыць будаўніцтва радыёзавода і перайсці працаваць у новыя, светлыя, утульныя цэхі, на новую работу. Вялікую дапамогу ў рабоце брыгады аказваюць прараб т. Бычкоў і дзесятнік тав. Дукан.

Работніцы-будаўнікі правільна спалучаюць работу на заводзе з вучобай і грамадскай работай. Усе члены брыгады Хамяковай наведваюць вячэрнія курсы па вывучэнню радыётэхнікі. Гэта будучыя кадры радыёзавода. Марусю Хамякову часта можна бачыць у кіно, за чыткай кнігі, газеты, каля радыёпрыёмніка, якім прэміравалі яе за выдатную работу на будаўніцтве.

Маруся Хамякова добры брыгадзір, арганізатар брыгады, па-стаханаўску змагаецца за выкананне пастановы партыі і ўрада аб хутчэйшым сканчэнні будаўніцтва радыёзавода. Яна дала слова працаваць яшчэ лепш і атрымаць пераходны сцяг завода.

Е. Лось.

Мінск.

Высокая ўзнагарода

Батура Марфа Мінаўна ўвесь час славіцца ў калгасе сваёй адданай і чэснай работай. Яна з'яўляецца перадавіком сельскай гаспадаркі. На любым участку работы апраўдвае сябе, як падабае гэта чэснаму совецкаму грамадзяніну. І калі на якім-небудзь участку ў калгасе работа не ладзілася, то туды пасылалі Марфу Мінаўну.

Вось факт. Малочна-таварная ферма была самым адстаючым звяном у калгасе. Быў вялікі адыход маладняка. У 1937 годзе праўленне калгаса пастанавіла паслаць на ферму Марфу Батура. За кароткі час Марфа Мінаўна дабілася значнага паляпшання работы. На ферме разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва паміж даяркамі. Кожная старалася павысіць удой малака ад абслугоўваемых ёю кароў.

У соцыялістычным спаборніцтве першае месца заўсёды займае тав. Батура. За мінулы год яна надаіла ад 10 кароў 26 750 літраў малака, поўнасцю захавала прыплод маладняка ад усіх кароў сваёй групы.

За высокія паказчыкі ў галіне развіцця жывёлагадоўлі тав. Батура была ўдзельніцай Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1939 года. Совецкі ўрад высока ацаніў пладатворную работу даяркі і ўзнагародзіў тав. Батура малой залатой медаллю. Гэтая ўзнагарода натхняе Марфу Батура і ўсіх калгаснікаў калгаса працаваць толькі па-стаханаўску, дабівацца яшчэ лепшых паказчыкаў у сваёй рабоце. Тав. Батура заяўляе:

— Я буду працаваць толькі выдатна, працаваць так, каб заваяваць зноў ганаровае права быць удзельніцай Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1940 года.

Агінскі.

Чэрыкаўскі р—н.

Сёстры

У мястэчка Супрасль прыехаў новы ўрач. Ні больніцы, ні амбулаторыі мястэчка ніколі за доўгі час свайго існавання не мела. Дзяцей і дарослых ад усіх хвароб лячыў сямідзесяцігадовы стары ўрач Васілій Васільевіч Скварцоў, якому даўным-даўно трэба было адпачываць. Ён дрэнна бачыў, яшчэ горш чуў і ўсе хваробы падзяляў на два віды—грып і рэўматызм. Лячыў Васілій Васільевіч зусім дзіўнымі, якія ён сам прыдумаў, працэдурамі: бегам, хадзьбою, прысяданнямі. Ён найстражэйшым чынам загадваў старэнькай бабульцы, хварэўшай калітам: «Прабяжыцеся, родненькая, прабяжыцеся!»

Не гледзячы на такія недарэчнасці ў Скварцова не было адбою ад пацыентаў. Жарты—адзін урач амаль на цэлы павет. У апошні час стары сябе дрэнна адчуваў і пазбягаў хворых, таму ў мястэчку за лекавай дапамогай і не было да каго звярнуцца. І раптам такая падзея—у мястэчка прыехаў новы ўрач з Мінска.

Елена Сцяпанаўна Ліпская—жанчына 29 год з светлымі каштанавымі валасамі, правільнымі рысамі твару, высокая, зграбная—не паспела абаснавацца ў маленькім нумары адзінай у мястэчку гасцініцы, вельмі недарэчна названай «Уют», як у карыдоры ўжо была цэлая чарга з мясцовых жыхароў. У многіх жанчын былі на руках дзеці.

Гаспадыня гасцініцы, маленькая пухлая цётка Боша, са здзіўленнем глядзела—чаго гэта без канца прыбывае народ у звычайна пуставаўшыя яе «апартаменты». З аднаго з пакояў вышла Елена Сцяпанаўна. Яе адразу пазвала некалькі галасоў:

— Доктар!

— Дарагі доктар...

— Мы да вас, доктар...

Ліпская спынілася.

— У чым справа, таварышы?

На руках у пажылой жанчыны яна заўважыла трохгадовае дзіця з сіняватым ад хваробы тварам. Яно дрымала ад слабасці, зрэдку на міг адкрываючы вочы. У Ліпскай зашчымела сэрца ад болю.

— Значыцца вы да мяне?—загаварыла Елена Сцяпанаўна. — Вельмі, вельмі рада! Але я нават не ведаю, дзе тут амбулаторыя. Я толькі прыехала.

Адна з бабулек у чорнай хустачцы, якая стаяла каля дзвярэй, голасна адказала:

— Амбулаторыі ў нас няма. У нас быў Скварцоў—то яго самаго лячыць трэба. Прысядайце, прайдзіцеся,—перадражніла яна старога ўрача, і ўсе сабраўшыяся рассмяяліся.

— Тады ведаеце што?—сказала Ліпская.—Я пайду зараз у часовае ўпраўленне, дагаварыся і сёння-ж назначу першы прыём. А вы цяпер заходзьце да мяне ў нумар,—сказала яна, зварочваючыся да жанчыны, якая трымала на руках знясіленага хлопчыка. Тая ажывілася і пяшчотна пагладзіўшы сына сказала:

— Пойдзем, Вовачка, пойдзем, любы,—гэта цёця вельмі добрая, яна табе дапаможа.—На голас мацеры хворае дзіцё адкрыла чырвоныя ўспалёныя вочы.

Пяць год назад Ліпская скончыла медыцынскі інстытут. Работніца швейнай фабрыкі, яна ў дзяцінстве не змагла задаволіць сваёй ненасытнай цягі да вучобы і вучыцца пачала позна. Бацька Ліпскай—матрос волжскай флатыліі загінуў у няроўным баі пад Астраханню, маці—сялянка палескай вёскі асталася з пяццю малымі дзецьмі на руках. Сястра мацеры жыла пад Пінскам і ў 1921 годзе, калі бежанцы пасля пяці год вандравання пачалі вяртацца на свае наседжаныя месцы, Ольга Ліпская, маці Елены, адправіла з адным з бежанцаў сяроднюю дачку Кацю да сястры.

Тыфус дачасна забраў гаротную сялянку ў магілу і чатыры дочкі Ліпскіх, якія асталіся на совецкім баку, разбрыліся хто куды. Каця быццам у ваду ўпала... Маню, Соню і Тоню—самых малодшых забралі ў дзіцячы дом. Елена паехала ў горад, была хатняй работніцай. Праз некаторы час пайшла працаваць на фабрыку. Вучылася ў вячэрняй школе і скончыла яе ў ліку першых. Яшчэ і цяпер Елена Сцяпанаўна беражэ пахвальны ліст, напісаны рукой дырэктара. Падругі здзівіліся, калі Ліпская абвясціла ім, што ідзе на медфак. Ці не занадта смела? Яна сама смеючыся гаварыла:

— Я буду першым урачом з усяго роду Ліпскіх, разумееце гэта, дзяўчаты? Першым за цэлыя стагоддзі!

Праз пяць год малады ўрач Елена Ліпская з запалам узялася за новую работу. Яна магла астацца ў горадзе, але сама заявіла, што жадае ў вёску і не ў якую-небудзь, а ў самую далёкую. Няхай нават за 40 кілометраў ад чыгункі.

На апошнім курсе Елена рыхтавалася к лекцыям разам са студэнтам Верашчагіным, смуглатварым, кучаравым хлапцом, які ганарыўся тым, што бацька яго правёў жыццё ў цыганскім таборы. Верашчагін уладаў цудоўным голасам. Быў незамянімым удзельнікам студэнцкіх канцэртаў і па прызнанню многіх ён памылкова выбраў медыцынскі факультэт,—яму патрэбна было пайсці ў тэатр.

Ужо перад выпускнымі экзаменамі, позняй вясной, у самую прыгожую пару, Ілько пяшчотна назваў Ліпскую «Ленуся».

З гэтага часу іх дружба і любоў стала яшчэ больш прыкметнай. Часта на лекцыях, слухаючы прафесара яна і сама таго не заўважаючы глядзела ў той бок, дзе сядзеў Верашчагін. Лавіла яго погляд і на сэрцы рабілася цёпла, проста, добра.

Яны абодвы з аднолькавай высокай ацэнкай скончылі інстытут, у адзін і той-жа дзень атрымалі дыпломы. Здавалася ім і далей давядзецца ісці адной дарогай. Але тут Елену чакала непрыемнасць. Ілько не меў жадання паехаць у сяло. Наадварот, ён усімі праўдамі і няпраўдамі рашыў замацавацца ў горадзе. На трэці ці на чацверты дзень па сканчэнні экзаменаў Верашчагін вечарам зайшоў на кватэру да Елены небывала вясёлы і таржаствуючы. Яшчэ з парога ён радасна крыкнуў:

— Ленуся, устроена!..

Елена не разумеючы паглядзела на яго.

— У чым справа, Ілько?

Ён падышоў да стала і выняў з кішэні беражліва складзеную паперку, якая яму дасталася цаной вялікіх намаганняў:

— Чытай!

— У чым справа? — паўтарыла Елена.

— Накіраванне ў гарадскую больніцу. Мне і табе...

— Пастой!—рэзка абарвала дзяўчына хлапца.—А я цябе праціла? Кажы, праціла? Ведаеш,—гэта гнуснасць, гэта падлог. Ты пайшоў на падлог!—кідала Ліпская гнеўныя, абураючыя словы.

Верашчагін спачатку хацеў супярэчыць, але Елена ўзбуджана абарвала яго:

— Кінь! Чуеш? Кінь! Я бачу, што нам не па дарозе...

Хутка забраўшы са стала складзеную паперку, Верашчагін адзеў шапку і не развітаўшыся вышаў...

Елена прыехала ўрачом у невялікую сельскую больніцу, адкрытую год назад. Больніца змяшчалася ў маленькім, непрыстасаваным доміку. Радзільнае аддзяленне было разлічана ўсяго на аднаго чалавека. Фельчар Волевашка, які загадваў больніцай, у гэты час пераехаў на сталае месца жыхарства ў горад, да сына, і загадванне больніцай легла на плечы Ліпскай. Яна дабілася ў райвыканкоме і ў сельсавеце новага памяшкання і пашырыла радзільнае аддзяленне да 10 ложкаў. Амаль кожны дзень пачала наведваць сялянскія хаты, аглядаць дзяцей, даваць парады мацерам, як карміць, купаць і ахоўваць ад захворванняў дзяцей.

Елена адчувала патрэбу ў кіпучай дзейнасці і нават пасля 11—12-гадзіннага рабочага дня ёй здавалася, што яна зрабіла яшчэ мала. Сон таксама не быў спакойным. Прыязджалі за 10—15 кілометраў, запрашалі да дзяўчынкі, якая выпадкова апарылася, да пажылай жанчыны, якая вывіхнула нагу. Елена хутка ўскоквала з ложка, на хаду апраналася і, праз некалькі мінут выходзячы ў пярэднюю, дзелавіта пыталася:

— Хто прыехаў за мной? Давайце паедзем...

Уся Зарудня праводзіла свайго любімага ўрача, калі ў жніўні 1939 года Елену Сцяпанаўну прызвалі ў Армію.

Спачатку Смаленск, напоўненыя кіпучай вучобай дзесяцідзённыя курсы, а потым авіяцыйная часць, размешчаная амаль ля самай граніцы. Упершыню, пасля сканчэння медыцынскага інстытута і пяці год практыкі, Елене Сцяпанаўне прышлося апынуцца ў такой напружанай абстаноўцы і прадстаўляючыся камандзіру часці, яна дзесьці ўнутры адчувала баязлівасць.

— У нас народ здаровы, хварэць не любіць,—смяючыся сказаў каман-

дзір часці.—Але-ж вы на ўсякі выпадак будзьце гатовы.

17 верасня камандзір часці, чарнавалосы, высокі лётчык, першым падняўся ў паветра і першым перасек граніцу. Яго чакалі праз гадзіну, але ўжо прайшло паўтары-дзве гадзіны, а самалёта не было і радысты не маглі ўлавіць пазыўных сігналаў. Ужо на пошукі рыхтаваліся два хуткіх знішчальнікі, як раптам за лесам загудзеў матор. Як заўсёды па-майстэрску камандзір пасадзіў машыну, лётчыкі гуртам кінуліся да яго.

— Доктара! Доктара!—пачулася з першых радоў.

Толькі што флагманскі самалёт удзельнічаў у баю, развеяў варожую эскадрыллю, камандзір узяў зваротны курс. Ранены ў руку ён не пакінуў штурвала.

Ліпская задыхаючыся ад бега спынілася каля самалёта. Пакінуўшы ўсё, яна бегла да раненага камандзіра. Тут-жа на аэрадроме зрабіла першую перавязку. У поўдзень санітарны самалёт адвёз яе на перадавыя пазіцыі. Яна хутка прызвычаілася да паходных умоў і ўсё, што было да вераснёўскіх дзён, здавалася ёй далёкім, далёкім. Дзень і ноч бачылі лётчыкі ўрача на нагах і часам уголас здзіўляліся яе вытрымцы. Елена даглядала раненых. У вёсках Заходняй Беларусі, якія сустракаліся па дарозе, аглядала хворых, заходзіла ў сялянскія хаты. У душы яна марыла аб сустрэчы з Кацяй. Ці жыва яна, якая яна? Няўжо яна такая як і ўсе гэтыя сотні забітых жанчын.

Прайшоў месяц паходнага жыцця. Елена прызвычаілася да яго. І раптам тэлеграма з Наркамздрава: «Дагаворанасці ваенным камандваннем пераводзіцеся мястэчка Супрасль арганізашыі совецкай аховы здароўя»...

Багата жыў пан Ардэмскі. У яго двухпавярховым палацы свабодна магла-б змясціцца палова жыхароў мястэчка Супрасль. Але пан Ардэмскі—адзінокі, суровы і маўклівы стары хацеў займаць адзін усе 30 пакояў свайго ўпрыгожанага антычнымі скульптурамі асабняка. З усіх месяцаў года пан асабліва не любіў кастрычнік. У 1917 годзе ў кастрычніку пан Ардэмскі, тады член дзяржаўнай думы, быў у Петраградзе і пры першай вестцы аб паўстанні матросаў і рабочых склаў свае чамаданы. Верасень 1939 года пану Ардэмскаму таксама прышоўся не па смаку, як і кастрычнік 1917 года. Уначы пан без дапамогі шофера вывеў з гаража машыну і скрыўся ў румынскім напрамку. Жыхары мястэчка Супрасль знайшлі больш практычнае прыстасаванне для палаца пана Ардэмскага і іменна ў гэтым палацы Ліпская дабілася адкрыцця першай больніцы з амбулаторыяй.

Вестка аб гэтым з быстрынёй маланкі абляцела ўвесь павет. Старэнькая Еўдакія Букашко прышла на агляд да ўрача за чатыры кілометры. У Букашко ўвесь локаць у нарывах. Пакутавала, прыкладала лісці, грэла. Нічога не дапамагала. Раніцой устала Букашко, завязала ў вузельчык дзесятак яечак і пайшла ў мястэчка, дзе была больніца і дзе ўрач добры з Мінска прымае. Ліпская ўважліва агледзела хворую з далёкай вёскі, сама зрабіла перавязку, распытала як жывецца, хто дапамагае. Букашко выціраючы слёзы расказвала аб адзіным сыне, загубленым у дэфензіве. Адыходзячы старая на відным месцы пакінула свой клуначак.

— Бабулька вы штосьці забылі!—паклікала яе Ліпская.

Старэнькая паглядзела і здзіўлена сказала:

— А я гэта табе родная! Грошай ні капеечкі, так ужо не асудзі старую, вазьмі яечкі.

Ліпская схапіла клуначак і дагнаўшы старэнькую аддала яго.

— Бярыце, бярыце, бабулька! Совецкаму ўрачу непатрэбны падачкі.

Прымаючы клуначак, старая падцягнуўшы да сябе Ліпскую, моцна пацалавала яе.

Як і ў Зарудні, у Супраслі да Ліпскай часта зварочваліся з просьбай выехаць у сяло. Яна не адмаўляла ў гэтым. Аднойчы пад вечар, адчуваючы сябе дрэнна Елена Сцяпанаўна збіралася легчы ў ложак, але ў гэты час да яе пастукаліся.

— Уваходзьце!

Малады сялянскі хлапец збянтэжана зняў шапку, спыніўся ля дзвярэй.

— Маці ў мяне моцна захварэла, ці не пад'ехалі-б вы паглядзець.

Елена Сцяпанаўна паглядзела на сарамлівага хлапца і адказала:

— Я зараз. Паедзем...

Праз некалькі мінут яна сядзела ў простай павозцы побач з хлапцом, які маўкліва кіраваў канём.

— Даўно маці хворая?

— З год пакутуе.

— Урачы глядзелі яе?

— Быў якісьці ў пачатку хваробы. Маліцеся—кажа. З малітвай усё пройдзе. А які чорт? Ёй усё горш ды горш...

Далей паехалі моўчкі. Ужо было зусім цёмна, калі яны прыехалі ў невялікую вёску, цмяна асветленую двума падслепаватымі газавымі ліхтарамі. Звярнулі ў вузкі завулачак і каля маленькай пакасіўшайся хібаркі хлапец са словам «прыехалі», спыніў каня.

Ліпская павінна была сагнуцца, каб увайсці ў дзверы. Усё ў цёмным пакоі здзіўляла сваёй беднасцю ці нават больш—нішчатой. Каля сцяны стаялі драўляныя нары і на іх у поўзабыцці ляжала пажылая жанчына з непа гадах састарыўшымся тварам.

— Мама, доктара прывёз,—разбудзіў сын маці.

Жанчына прыпаднялася і зноў цяжка апусцілася на жорсткую падушку. Ліпская зняла пальто і падышоўшы да хворай пачала прыслухоўвацца да цяжкага дыхання жанчыны.

Потым яна доўга выстуквала хворую, прыкладалася да спіны. Ужо па аднаму дыханню дыягназ быў ёй яскравым. «Лёгкія, хвароба, абвастрыўшаяся недаяданнем»...

Хворая прыпаднялася з падушкі, ціха паклікала Ліпскую.

— Мне сын гаварыў, што вы з Мінска. У мяне на Беларусі маці, сёстры. Вы не ведаеце іх?

— Маці, сёстры, — настаражылася Елена Сцяпанаўна.

— На Палессі жывуць, Ліпскія...

— Каця,—крыкнула Елена. Яна зірнула на гэтую старую, ледзь не страціўшы прытомнасці.

Дзве родныя сястры, па рознаму пражыўшыя свае годы, доўга не верылі ў сустрэчу, доўга дзяліліся паміж сабой пражытым, якое, як бяздонне, аддзяляла жыццё двух Ліпскіх—Елены і Кацярыны.

САДОЎСКІ.



Сотні заяў паступае ад моладзі заходніх абласцей у райвыканкомы аб жаданні паступіць на курсы трактарыстаў, камбайнераў, шофераў.

На здымку: Першыя дзяўчаты заходніх абласцей (Брослаўскі раён, Вілейская вобласць), якія накіраваны на курсы трактарыстаў у Смілавіцкую школу Мінскай вобласці. Справа налева: М. І. Петкун і З. В. Грышчэнка.

Фота Я. Салавейчыка.

ПРЫКЛАДНАЯ НАСТАЎНІЦА

Гэта было на ўроку арыфметыкі. Настаўніца Наталля Васіллеўна Вайтовіч увайшла ў клас. Вучні сядзелі за партамі і рыхтаваліся да пісьмовай працы. Валодзя, апусціўшы галаву, аб нечым думаў.

— Валодзя, чаму ты не пішаш?—запыталася настаўніца.

Валодзя падняў галаву і спакойна адказаў:

— Наталля Васіллеўна, не задавайце мне да хаты задачак, цяжка даецца мне арыфметыка. Лепш буду пісаць або чытаць.

Настаўніца, супакоіўшы вучня, прадаўжала ўрок.

Заняткі ў класе скончыліся. Наталля Васіллеўна выклікала Валодзю ў настаўніцкую, пагутарыла з ім і паабяцала яму дапамагчы. Кожны дзень пасля заняткаў настаўніца дапамагала Валодзі развязваць арыфметычныя задачы, і праз некаторы час арыфметыка ў Валодзі стала самым любімым прадметам. Цяпер ён лепшы выдатнік у класе. Такіх вучняў, якім быў раней Валодзя, у класе было многа. Настаўніцы прыходзілася працаваць з кожным з іх паасобку, арганізоўваць дружбу сярод дзяцей. Яна прывівала вучням любоў да навукі, да кожнага асобнага прадмета.

Наталля Васіллеўна Вайтовіч працуе настаўніцай ужо 25 год. Яна выхавала сотні дзяцей, якія дагэтуль скончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы і зараз працуюць інжынерамі, урачамі, аграномамі, настаўнікамі. Тав. Вайтовіч актыўны грамадскі работнік. Часта яе можна бачыць сярод калгаснікаў. Яна гутарыць з імі, чытае ім газеты, кніжкі.

Тав. Вайтовіч карыстаецца вялікім аўтарытэтам у вёсцы. Яе паважаюць бацькі і вучні за выдатныя поспехі ў навучанні, за выдатную пастаноўку вучэбнай работы і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці.

Іван Качан.

Окцябрскі раён.

Народная настаўніца Марыя Нікіцічна Саракалетава. Кіруе двумя малодшымі класамі 18 сярэдняй школы імені Н. К. Крупскай (Мінск). Працуе педагогам 41 год. Вядзе актыўную грамадскую работу ў школе.

ПЕРАДАЮ СВОЙ ВОПЫТ

На запалкавай фабрыцы імені Кірава (г. Барысаў) я працую з 1932 года. Як толькі ў нашай краіне разгарнуўся стаханаўскі рух, я разам з многімі рабочымі нашай фабрыкі ўключылася ў гэты выдатны рух і перайшла працаваць на дзве машынкі. Пяць год ужо як я працую на двух каробка-клеельных машынках. За гэты час я значна ўзбагацілася вопытам у абслугоўванні іх. Вытворчае заданне выконваю на 115—120 процантаў.

Як я дабілася такіх паказчыкаў? Прышоўшы на работу, перш за ўсё я аглядаю машынкі, зацягваю паперу, пасля гэтага толькі пачынаю працаваць. Для эканоміі рабочага часу і павышэння прадукцыйнасці працы я рашыла заўсёды знаходзіцца каля адной машынкі. Запас донышак і шчапы таксама кладу каля адной машынкі і закладаю іх у абедзве машынкі, стоячы на адным месцы.

Калі рвецца лента адначасова на абодвух машынках, зацягваю паперу спачатку на той, дзе матэрыялу закладзена больш і пускаю ў ход яе, а потым раблю зацяжку на другой.

Вопыт сваёй работы я перадаю другім рабочым свайго цэха праз створаныя стаханаўскія школы. Цяпер я вучу працаваць на двух станках работніц тт. Дрыц і Дуброўскую.

Канкрэтнымі справамі адказваюць работніцы-стаханаўкі зборачнага цэха на зварот маскоўскіх інструменталышчыкаў. Узятыя абавязацельствы яны выконваюць з гонарам. Напрыклад, машыністкі набівачных машын тт. Жуковіч, Казыра, Качагіна, Скавародкіна, Качан, Дубіна і другія пры норме ў 62 тыс. каробак абавязаліся выпрацаваць па 75 тыс., а выпрацоўваюць па 80—83 тысячы высокаякасных каробак. Значна знізіўся вытворчы брак. Адыходу каля машын з кожным днём становіцца ўсё менш.

Рабочы калектыў нашай фабрыкі ўключыўся ў соцыялістычнае спаборніцтва за выкананне пяцігадовага плана ў чатыры гады па росту прадукцыйнасці працы. Свае абавязацельствы наш калектыў выканае з гонарам.

В. Ярашэвіч.

г. Барысаў.

АКУШЭРКА БАСКІНА

За перыяд работы ў Чырвонапольскай больніцы Цыля Саламонаўна Баскіна заваявала сабе вялікі аўтарытэт і сімпатыю з боку насельніцтва. Кожны, хто толькі ведае т. Баскіну, з павагай скажа,—гэта добры работнік, чулы таварыш. Такая характарыстыка зусім правільная.

Рабочы дзень т. Баскінай поўны клопатамі аб хворых. Яна з выключнай увагай адносіцца да кожнай хворай жанчыны.

Не так даўно быў такі выпадак. Прывезлі з сельсовета цяжка хворую калгасніцу. Марудзіць не было калі. Кожная мінута замаруджвання пагражала смерцю. Цыля Саламонаўна адразу-ж звярнулася да ўрача тав. Барысенка. І толькі дзякуючы дасканаламу выкананню ўсіх яго ўказанняў, жыццё калгасніцы было выратавана.

Акушэрка Баскіна таксама і добры грамадскі работнік. Яна ўжо больш двух год працуе сакратаром мясцкома. Цылі Саламонаўне даручана адказная і ганаровая работа—быць акушэркай. Яна з чэсцю апраўдвае сябе на рабоце.

Галіна Рабая.

Чырвонаполле.

ПАХОДЖАННЕ І КЛАСАВАЯ СУТНАСЦЬ ВЯЛІКАДНЯ

Хрысціянскае свята вялікдзень канчаткова склалася ў II—III вяках нашай эры, г. зн. 1600—1700 год назад. Крыніцай хрысціянскага вялікадня паслужылі, з аднаго боку, дрэўнееўрэйскі вялікдзень, а з другога—шматлікія веснавыя язычаскія святы «смерці і васкрасення спасіцеляў».

У яўрэяў вялікдзень зарадзіўся яшчэ тады, калі яны займаліся жывёлагадоўляй, г. зн. прыкладна за паўтары тысячы год да хрысціянскай эры. Вясной, калі размнажалася жывёла, яўрэі звычайна адзначалі гэты важны ў гаспадарчых адносінах момант вялікім рэлігійным святам. Прыносілі казлят і ягнят у афяру богу пладароддзя, калі гэта афярнае мяса. Адсюль, як відаць, гэта вясенняе свята атрымала назву «вялікадня», г. зн. «уміласціўлення» (богоў).

У многіх народаў, якія займаліся земляробствам вельмі даўно, яшчэ раней чым у яўрэяў, спраўляліся вясенніх святы ў гонар багоў—пакравіцеляў раслиннага света. Такімі багамі-пакравіцелямі былі: у старажытных егіпцян—Озірыс, у грэкаў—Дзіоніс, у фрыгійцаў—Атціс, у фінікіян—Адоніс і т. д.

Бачачы лёс зярна, пахаванага (пасеянага) у зямлю і потым вырастаючага, старажытназемляробчыя народы ўзнаўлялі гэты лёс у абрадах вясенніх свят памірання і ўваскрашэння багоў раслиннасці.

Звычайна вясеннее земляробчае свята састаяла з двух адрозніваючыхся друг ад друга частак. Першыя дні захоўваўся строгі пост і наогул усякае ўстрыманне. Богаслужэнне было цемрай. Успаміналіся пакуты і мучаніцкая смерць бажаства. Другая частка—яркая, радасная, светлая. Жрацы аблачаліся ў светлую вопратку, цёмнае богаслужэнне змянялася радасным, свята прымала характар абжорства і разгула. Пазней, бліжэй да эпохі хрысціянства вясеннія язычаскія святы страцілі свой чыста земляробчы характар і набылі глыбокае соцыяльнае значэнне. Гэта была другая крыніца, з якой склаўся змест хрысціянскага вялікадня.

Ад вясенніх язычаскіх свят вялікдзень успрыняў галоўным чынам абрадавую старану: пост, страсную сядзьміцу, жалобныя богаслужэнні, успаміны аб пакутах і смерці Хрыста, вынас плашчаніцы, разгавенне, многадзённы п'яны разгул і, нарэшце, самую ідэю «васкрасення спасіцеля».

Так быў створан хрысціянскі вялікдзень. Паходжанне вялікадня, як бачым, наскрозь зямное, цяснейшым чынам звязана з развіццём грамадскіх адносін.

У старой, забітай царскай Расіі памешчыкі, кулакі і капіталісты заўсёды і ўсяляк імкнуліся адовяткаваць вялікдзень як можна больш урачыста, як можна больш пышна. Гэта ім было выгадна, бо вялікодныя богаслужэнні на вялікі тэрмін уперад заражалі веруючых рабочых і сялян рабскай ідэалогіяй, карыснай эксплаататарам.

У аснове свята вялікадня ляжаць дзве рэакцыйныя ідэі, накіраваныя сваім астрыём супроць працоўных—рабочых, сялян, інтэлігенцыі.

Першая ідэя заключаецца ў прапагандзе «вечнага жыцця за гробам». Хрыстос, быццам, сваім васкрасеннем іскупіў грахі людзей і даў ім права на вечнае жыццё. Усяляк здзекуючыся на працягу вялікага паста над чалавечым арганізмам і яго законнымі здаровымі патрабаваннямі царква як-бы ўнушае, што адзінае ў чалавеку, аб чым ён павінен клапаціцца,—гэта яго душа, якая будзе жыць «за гробам». Карыснасць гэтай ідэі аб загробным жыцці для мэт эксплаатацыі яскрава сама сабой. Душа есці не просіць. Таму працоўным прапануецца цярпець цялесныя, фізічныя пакуты ў «зямным» жыцці з тым, каб душы іх шчасліва жылі... пасля смерці.

Другая, не менш рэакцыйная ідэя заключаецца ў заклiку да класавага міру. «Абдымем друг друга»—вось вялікодны лозунг, які паўтараецца на тысячы ладоў ва ўсіх пропаведзях, ва ўсіх вялікодных богаслужэннях. Гэты лозунг цалкам выцякае з папоўскай хлуснi аб «вечным жыцці за гробам». На самой справе: калі зямныя інтарэсы—нішто ў параўнанні з нябеснымі, то ці трэба змагацца з эксплаататарамі.

Наадварот, чым больш працоўны перанясе пакут і мучэнняў і чым хутчэй скончыць ён сваё зямное жыццё, тым лепш, бо тым хутчэй атрымае райскае шчаслівае жыццё.

Вялікдзень працягвае і зараз у нашай краіне адыгрываць рэакцыйную ролю. Вялікодныя пропаведзі ўмацоўваюць у сазнанні адсталых працоўных варожую рэлігійную ідэалогію. У дні вялікадня нараджаюцца агідныя перажыткі старога быта, наносіцца ўбытак соцыялістычнай вытворчасці, у асаблівасці сельскай гаспадаркі.

Вялікдзень падобна другім рэлігійным святам узмоцнена скарыстоўваецца антысовецкімі элементамі ў іх барацьбе з соцыялістычным будаўніцтвам. Вялікдзень як і другія рэлігійныя святы на-руку ворагам соцыялізма, на руку капіталістычнаму акружэнню. Усемагчымымі спосабамі капіталістычнае акружэнне аказвае ідэйную, а часамі і матэрыяльную падтрымку духавенству. Для ворагаў совецкага народа надзвычай важна, каб рэлігійныя забабоны наносілі тую ці іншую шкоду соцыялістычнай гаспадарцы і маглі-б быць скарыстаны для подлай, антысовецкай работы.

У 1912 годзе таварыш Сталін у першамайскай лістоўцы пісаў: «У кожнага класа маюцца свае ўлюбёныя святы. Дваране завялі свае святы, на іх яны аглашаюць «права» абірашня сялян. Буржуа маюць свае і на іх яны «апраўдваюць» «права» эксплуатацыі рабочых. Есць святы і ў папоў і на іх яны ўсхваляюць існуючыя парадкі, дзе працаўнікі гінуць у нішчаце, а дармаеды ўтапаюць у раскошы.

Павінна быць сваё свята і ў рабочых і на ім яны павінны агласіць: усеагульная праца, усеагульная свабода, усеагульная роўнасць усіх людзей. Гэта свята—свята першага мая».

З таго часу як пісаліся гэтыя радкі, прайшло многа год. У нашай краіне знішчаны эксплаататарскія класы дваран, буржуазіі, кулацтва, у асноўным пабудаван соцыялізм і цяпер адбываецца паступовы пераход ад соцыялізма да комунізма.

Рабочыя, калгаснікі і інтэлігенцыя Совецкага Саюза ў значнай масе парвалі з рэлігіяй. Але ёсць яшчэ не мала веруючых працоўных у палоне ў рэлігіі, працягваючых святкаваць вялікдзень. У гэтым годзе вялікдзень супадае з днямі падрыхтоўкі да 1 Мая. Наша задача заключаецца ў тым, каб сустрэць вялікодныя святы ўзмацненнем масавай антырэлігійнай агітацыі і прапаганды. Мы павінны нястомна выкрываць рэлігійныя забабоны і рэлігійных мракабесаў.

Трэба з усёй рашымасцю ўскрываць і перасякаць антысовецкія вылазкі класавага ворага, які пад маскай рэлігіі будзе імкнуцца працягваць сваю контррэволюцыйную, процінародную справу.

Ф. Олешчук.

Цана 20 кап. Да гэтага нумару бясплатна дадаецца ўкладка-выкрайка

Карысныя парады

Аб доглядзе за зубамі і поласцю рота

Хворыя зубы не толькі псуюць выгляд чалавека. Ад іх ідзе дрэнны пах з роту, яны перашкаджаюць яснаму вымаўленню і небяспечны для здароўя. Так, напрыклад, захворванні страўніка часта бываюць ад дрэннага пражоўвання стравы з-за хворых зубоў ці адсутнасці асобных зубоў.

Лепшы спосаб захаваць зубы ад псавання—правільны догляд за імі і поласцю рота.

З ранняга ўзроста (з 3—4 год) трэба прывучаць дзіця да зубной шчоткі. Малочныя зубы ў дзяцей патрабуюць такога-ж догляду, як і пастаянныя.

Зубы трэба чысціць шчоткай, зубным парашком ці зубной пастай штодзённа, як раніцой, так і вечарам перад сном. Чысціць трэба энергічна ва ўсіх напрамках (з знадворнага і ўнутранага боку), каб не асталося ў прамежках паміж зубамі кавалачкаў ежы; карысна таксама праціраць дзёсны. Пасля гэтага рот трэба прапаласкаць вадой, лепш з дабаўленнем зубнога эліксіра.

Паласкаць рот рэкамендуецца пасля кожнай ежы.

Неабходна сачыць і за чыстатой зубной шчоткі. Пасля карыстання яе трэба добра вымываць. Хаваць зубную шчотку трэба ў вертыкальным становішчы ручкай уніз. У гэтым становішчы яна лепш і хутчэй высыхае і далей захоўваецца.

Два разы ў год трэба паказацца зубному ўрачу для праверкі зубоў.

Догляд за скурай твара

Прыемны колер скуры твара дасягаецца, у першую чаргу, правільным жыццём. Умеранае харчаванне, цвярозасць, фізкультура, нармальны сон захоўваюць здаровую скуру твара лепш, чым розныя касметычныя сродкі.

У скуры чалавека закладзены шматлікія сальныя залозы, якія заўсёды вырабляюць і выдзяляюць тлушчы, неабходныя для змазкі скуры. У залежнасці ад дзейнасці гэтых залоз і колькасці выдзяляемага тлушча выдзяляецца і ступень ажырэння скуры.

Зразумела, што догляд за тлустай скурай будзе рэзка адрозніваццa ад догляду за скурай сухой.

Тлустую скуру рэкамендуецца часта абмываць цёплай, амаль гарачай вадой з мылам, дабіваючыся гэтым знішчэння лішняга тлушча. Для абязжырвання скуры добра 2—3 разы ў дзень абціраць твар якім-небудзь слабым спіртавым растворам ці водкай з невялікай прымессю буры.

Наадварот, пры сухой скуры з недастатковым выдзяленнем тлушча рэкамендуецца на ноч абмываць твар цеплаватай ці пакаёвай вадой.

Таму, што сухая скура раздражняецца часамі і ад мыла, прыходзіцца часова ад яго адмовіцца. Для лепшага ачышчэння скуры да вады для ўмывання можна дабавіць 1—2 сталовых лыжкі рашчыны крахмала. Рашчына рыхтуецца наступным чынам: у стакане халоднай вады рашчыніць сталовую лыжку крахмала і ўліць тры стаканы гарачай вады.

Акрамя гэтага, пры сухой скуры перад сном рэкамендуецца лёгкае змазванне твара борным вазелінам, міндальным ці персікавым маслам. Ад гатовых крэмаў лепш устрымацца.

Вельмі сухую і раздражняльную скуру твара раніцой, перад выхадам на паветра, мыць наогул не трэба. Дастаткова асвяжыць чыстай вадой толькі вочы.

Частым недахопам тлустай скуры з'яўляюцца так званыя чорныя вугры, як кропкі, якія з'яўляюцца пераважна на носе. на ілбу і на падбародку. З'яўляюцца яны, галоўным чынам, пад уплывам механічнай закупоркі вывадных пратокаў сальных залозак пылевымі ці вуглявымі часцінкамі. Для папярэджвання з'яўлення чорных кропак рэкамендуецца абмыванне твара цёплай вадой з мылам і праціранне скуры адэкалонам ці аднапроцантным саліцылавым спіртам.

Для знішчэння чорных кропак можна ўжываць месныя паравыя ванначкі для твара (трымаць твар на працягу 10—15 мінут над тазам ці чайнікам з кіпяткам). Пасля гэтага скуру трэба вымыць і выцерці.

Калі чорныя кропкі высыпаюць у вялікай колькасці ці з'яўляюцца чырвоныя запалёныя і гнайнічковыя вугры, неабходна звярнуцца да ўрача для спецыяльнага лячэння.

Догляд за валасамі

Правільны догляд за валасамі папярэджвае іх захворванне, знішчае перхаць, папярэджвае дачаснае аблысенне.

Аснова правільнага догляду за валасамі—трыманне іх у чыстаце.

Валасы лёгка забрудняюцца. Пры недастатковым доглядзе ў іх лёгка збіраецца пыл, бруд, перхаць. Таму, не радзей чым адзін раз у 5 дзён, валасы трэба мыць гарачай вадой з мылам. Тлустыя валасы трэба мыць часцей: не радзей, чым адзін раз у 2—3 дні.

Мыльную пену трэба энергічна ўціраць у скуру галавы пальцамі. Змыўшы мыла, трэба яшчэ раз намыліць галаву, зноў змыць свежай вадой, а потым, змяніўшы ваду, добра прапаласкаць валасы, каб адмыць затрымаўшыеся на скуры галавы і валасах рэшткі мыла.

Для мыцця галавы асабліва прыгодны, выпускаемыя нашай прамысловасцю, вадкія сарты мыла. Вадкае мыла хутка пранікае да пакрытай валасамі скуры, дае багатую пену, добра рашчыняе і ўдаляе тлушч, перхаць і бруд. Да такіх сартоў адносяцца піксафоны і шампунь у вадкім выглядзе.

Тлустыя валасы рэкамендуецца мыць дзягцярным мылам, якое прадаецца ў сухім і вадкім выглядзе.

Адказны рэдактар В. КАГАН.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Савецкая, 49, 1 паверх.

Друкарня імя Сталіна. Зак № 2257 Тыраж 13000 экз. Уп. Галоўліта БССР № 179.
Здана ў друк. 27/III—40 г. Падпісана да друку 8/IV—40 г. У нумары 2½ друк. арк. 120.140 друк. знак.